ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры
Лідскага райвыканкама
_______ [illegible]ова Н.Ф.
_______ 2019 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ

аб правядзенні адкрытага рэгіянальнага
фестывалю-конкурсу частушачнікаў
"Гучыць прыпеўка звонкая"

Сапраўдная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення адкрытага рэгіянальнага фестывалю-конкурсу частушачнікаў "Гучыць прыпеўка звонкая" (далей - фестываль).

1. Асноўнымі мэтамі і задачамі фестывалю з'яўляюцца: адраджэнне, захаванне і развіццё самабытнага жанру народнай творчасці; выяўленне новых таленавітых выканаўцаў сярод аматараў, а таксама падтрымка дзеючых творчых калектываў; павышэнне ролі народных традыцый у сучаснай беларускай культуры; стварэнне магчымасці для самарэалізацыі калектываў і асобных выканаўцаў, з дапамогай іх прыцягнення да ўдзелу ў фестывалі; фарміраванне ў маладога пакалення пачуцця павагі да народнай культуры, як да асноўнай нацыянальнай самасвядомасці народа; прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем захавання і развіцця народнай музычнай культуры, да пераемнасці ў галіне народнага выканальніцкага мастацтва; выкананне музычнага твора з улікам змястоўнага аспекту.
2. Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца аддзел культуры Лідскага раённага выканаўчага камітэта (далей – аддзел), ДУ "Бярозаўскі гарадскі Дом культуры".
3. Фестываль з'яўляецца адкрытым, праводзіцца кожны год. Тэрміны правядзення фестывалю зацвярджаюцца загадам начальніка аддзела.
4. У 2019 годдзе адкрыты рэгіянальны фестываль-конкурс частушачнікаў "Гучыць прыпеўка звонкая" праводзіцца **19 кастрычніка** на базе ДУ "Бярозаўскі гарадскі Дом культуры".
5. У конкурсе прымаюць удзел індывідуальныя выканаўцы і аматарскія калектывы ўстаноў культуры ў наступных намінацыях:
   - ансамбль частушачнікаў;
   - дуэт частушачнікаў;
   - саліст-частушачнік;
6. На фестываль-конкурс удзельнікі прадстаўляюць адзін музычны нумар працягласцю не больш 5 хвілін.
7. Конкурс праводзіцца ў чатырох узроставых катэгорыях:
   - 5 - 15 год;
   - 16 - 30 год;

- 31 - 50 год;
- 51 і больш;

Пры змешаным складзе ўдзельнікаў узроставая катэгорыя вызначаецца па старэйшаму ўдзельніку

8. Касцюмы ўдзельнікаў конкурсу ўяўляюць сабой шматлікія варыянты арыгіналаў або копій традыцыйных народных касцюмаў.
9. Для непасрэднага кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем фестывалю ствараецца арганізацыйны камітэт (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца загадам начальніка аддзела.
10. Склад аргкамітэта фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў (са згоды іх кіраўнікоў), іншых зацікаўленых арганізацый.
11. Аргкамітэт:

11.1. ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем фестывалю;

11.2. разглядае і сцвярджае: спіс удзельнікаў фестывалю; праграму правядзення фестывалю;план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенню фестывалю; пры неабходнасці сімволіку фестывалю, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку;

11.3. ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі суб'ектамі культурнай дзейнасці, іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення фестывалю і яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі; вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення фестывалю.

12. Журы:
- ацэньвае выкананне ўдзельнікамі фестывалю-конкурсу твораў;
- афармляе пратаколы вынікаў выкананняў ўдзельнікамі фестывалю;
- вызначае пераможцаў і ўладальнікаў дыпломаў і памятных падарункаў фестывалю;
- інфармуе ўдзельнікаў фестывалю аб выніках іх удзелу ў фестывалі;
- разглядае звароты ўдзельнікаў фестывалю па выніках ацэнкі выкананняў.

13. Па выніках правядзення конкурсу, на падставе рашэння журы, усе ўдзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.
14. Пераможцы конкурсу ў чатырох узроставых катэгорыях (5 - 15 год, 16 - 30 год, 31 - 50 год, 51 і больш) узнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата (I,II,III ступені) і прызамі. Журы мае права не прысвойваць месцы, падзяляць II, III месцы, уводзіць новыя ці аб’ядноўваць намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду.
15. Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:
- узровень выканальніцкага майстэрства;
- арыгінальнасць нумара;
- стварэнне яркага сцэнічнага вобраза;
- увасабленне нацыянальнага каларыту;
- пераемнасць народных традыцый;

- вернасць этнічным традыцыям;
- эмацыянальнасць і непасрэднасць выканання.

16. Для ўдзелу ў фестывале да 14 кастрычніка 2019 года накіроўваецца заяўка (Дадатак 1) на электронны адрас: berezov_dom_kylt@mail.ru Даведкі па тэлефону: 8(0154)561479, 541969, тэл./факс: 8(154) 561479.
17. Афіцыйнае падцвярджэнне аб удзеле ў фестывалі-конкурсе "Гучыць прыпеўка звонкая" накіроўваецца аргкамітэтам на адрас калектыва (саліста) 17 кастрычніка 2019 года.
18. Пасля атрымання запрашэння калектыў (удзельнік) пералічвае на разліковы рахунак фестываля ці шляхам разліку праз касу арганізатараў конкурсу на момант рэгістрацыі (у дзень правядзення конкурса) ўзнос за ўдзел у памеры 5.00 (пяць) беларускіх рублёў ад кожнага ўдзельніка калектыву.

Разліковы рахунак аддзела культуры Лідскага райвыканкама:
BY30AKBB36322625000004200000, ф-л 413 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Лида, BIC AKBBBY21413, УНН 500826250 *(абавязкова ўказаць: "для дзяржаўнай установы "Бярозаўскі гарадскі Дом культуры" з паметкай "фестываль").*

19. Канкурсанты самастойна забяспечваюць сябе музычнымі инструметамі, фанаграмамі і касцюмамі, неабходнымі для выканання твора.
20. Фанаграмы падаюцца ў аргкамітэт разам с заяўкай, альбо гукарэжысёру не пазней, чым за 40 хвілін да пачатку конкурсу.
21. Не дапускаюцца конкурсныя выступленні вакалістаў пад фанаграму "плюс".
22. Удзельнікі фестывалю перад пачаткам конкурсу маюць права правесці апрабаванне сцэны (не больш за 5 хвілін кожны калектыў).
23. Пад час правядзення конкура забараняецца прысутнасць староннiх асоб за кулісамі (акрамя кіраўнікоў), выкарыстанне адкрытага агню, вадкасцей ці іншых рэчываў, якія могуць нанесці шкоду здароўю ўдзельнікаў, матэрыяльнай базе Дома культуры.
24. Адказнасць за захаванасць асабістых рэчаў, за выключэннем верхняга адзення, здадзенага ў гардэроб Дома культуры, нясуць самі ўдзельнікі ці суправаджаючыя асобы.
25. Фінансаванне выдаткаў на правядзенне рэгіянальнага фестывалю-конкурсу частушачнікаў "Гучыць прыпеўка звонкая" ажыццяўляецца за кошт сродкаў пазабюджэтнай дзейнасці Бярозаўскага гарадскога Дома культуры (дыпломы, прызы).
26. Для фінансавання фестываля-конкурса могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы фінансаваня, не забароненыя закандаўствам Рэспублікі Беларусь.
27. Аплата расходаў за праезд, харчаванне і пражыванне ўдзельнікаў ажыццяўляецца за кошт камандзіруючай стараны.

28. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі ўдзельнікаў да месца правядзення фестывалю і назад ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.
29. На мерапрыемстве вядзецца фота і відэаздымка. Арганізатары мерапрыемства пакідаюць за сабой права выкарыстоўваць дадзены матэрыял з рэкламнай мэтай мерапрыемства без узгаднення з калектывам або асобным выканаўцам.
30. Арганізатары не нясуць адказнасць за наяўнасць правоў на выкарыстанне заяўленых ўдзельнікамі твораў.
**31.** Удзел у фестывалі азначае поўнае і безумоўнае прыняцце правілаў дадзенай інструкцыі.